Ігуменскі тракт

Водар часу

# ЖЫВАПІС РАСКОЛІН І ТАЙНА ЗГУБЛЕНЫХ ДЭТАЛЯЎ

## Разгледзець у дэфектах найлепшыя эфекты запрашаюць гомельскія музейшчыкі

**В А ўласным музейным фондзе Гомельскага палацава-паркавага ансамбля мноства ўнікальных прадметаў, якія ці ніколі, ці адзін-два разы дагэтуль «выходзілі ў свет». На выстаўках, як правіла, у цэнтры ўвагі — рарытэты з добрай захаванасцю: яркія, запамінальныя, з цікавым гістарычным шляхам. Выставачны праект «Прыгажосць, народжаная часам» дае прастору і адкрывае ў свеце сафітаў музейныя рэчы, якія дайшлі да нашага часу не ў самым добрым стане. У расколінах на глазуры, кракелюры, паціне, адбітых элементах — іх кранальная прыгажосць.**



Адна з ідэй — наўмысна не рабіць акцэнты на самыя дарагія ці самыя рарытэтныя экспанаты. На выстаўцы сабрана больш як 130 прадметаў. Кожны па-свойму цікавы, а галоўнае — кожны можа выклікаць розныя, але шчырыя эмоцыі ў наведвальнікаў.

Ад зброі да посуду, ад прадметаў рэлігійнага культу да графічных работ... Усе прадстаўленыя прадметы выдатна дэманструюць, як час «бярэ ў абдымкі» дрэва, метал, паперу, шкло. Можна ўбачыць сапраўдную паціну на бронзе ці заўважыць як праз дзесяцігоддзі мяняюцца скура, тканіна.

— У цэнтральнай вітрыне — гадзіннікі часоў князёў Паскевічаў. Яны, з аднаго боку, сімвал часу, а з другога — як прадметы ў жыцці чалавека, самі падпарадкаваны законам старэння, — перадае адну з ідэй экспазіцыі **куратар выстаўкі, навуковы супрацоўнік музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля Вольга ШУРПАЧ.** — Можна ўбачыць тут і жырандоль, якая ў свой час стала адным з першых экспанатаў музея. Трапіла ў фонды ўжо ў зусім жаласным выглядзе, але вось у гэтай экспазіцыі сапраўды вельмі прыгожа загучала.

Можна пабачыць рарытэтныя газавыя лямпы: з металу і практычна цалкам са шкла. Цікава раскрываецца тэма адбіткаў часу на розных рэчах з фарфору.

— У Гомельскага палацава-паркавага ансамбля багатая калекцыя фарфоравага посуду. Фарфор, прадстаўлены на выставе, захаваўся з канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Вядома, у калекцыі музея ёсць фарфор добрай захаванасці. Прадстаўленыя прадметы больш пацярпелі ад часу. Але яны таксама заслугоўваюць увагі нашых наведвальнікаў. Тым больш што многія з гэтых рэчаў увогуле ніколі не былі паказаны на выстаўках, — зазначае **старшы навуковы супрацоўнік Гомельскага палацава-паркавага ансамбля Вольга ГВОЗДЗЬ.**

Знаўца звяртае ўвагу, што на ўсіх музейных прадметах час заўсёды пакідае ўнікальныя меткі.

— І нават калі ў калекцыю трапляюць зусім аднолькавыя прадметы, то за свой гістарычны шлях яны набываюць розныя сляды часу, а іх дэфекты ператвараюць у эфекты, — пераконвае Вольга Гвоздзь. — У экспазіцыі мы прадставілі нават зусім невялікія рэшткі посуду. Такія рэчы таксама прымаюцца ў фонды. Яны, як правіла, не знаходзяць сабе месца на вялікіх тэматычных выстаўках, але ў гэтым праекце выдатна дапамаглі перадаць феномен часу ў жыцці музейнага аб'екта. Нават па такіх рэштках музейных прадметаў можна аднавіць іх гісторыю, а калі нешта не ўдаецца аднавіць, то гэта надае рэчы дадатковую загадкавасць. Цікавасць выстаўкі яшчэ і ў тым, што на ёй прадстаўлены прадметы, якія паступалі ў музей некалькі дзясяткаў гадоў ці нават больш як паўстагоддзя таму. Тады ў спецыялістаў не заўсёды атрымлівалася прасачыць гісторыю, вызначыць, дзе і калі былі выраблены прадметы, з якіх матэрыялаў. Таму яшчэ адзін плюс нашага праекта ў тым, што рэчы, якія вельмі рэдка экспанаваліся ці ўвогуле ніколі раней не былі прадстаўлены, мы пачынаем больш старанна вывучаць, — дзеліцца Вольга Гвоздзь.

Усе экспанаты ў вітрынах дапаўняюць сухацветы. Так, праз кветкі перадаецца хуткаплыннасць жыцця, цвіцення, маладосці.

— Кветкі застаюцца прыгожымі нават пасля таго, як аддалі ўсе свае сокі, высахлі. Мы хацелі паказаць, што і нашы прадметы, нават калі выканалі сваю ўтылітарную функцыю, усё роўна нясуць эмацыянальную каштоўнасць. Важна, што ўсе гэтыя прадметы калісьці былі вельмі дарагімі людзям і, калі састарэлі, страцілі свой знешні выгляд, сталі нямоднымі, то не былі выкінуты, а перададзены ў музей, — звяртае ўвагу куратар выстаўкі Вольга Шурпач.

Часткай экспазіцыі з'яўляюцца і вершы паэтаў Сярэбранага веку, дзе ў паэтычным слове перададзеныя настрой і філасофія часу, зменлівасць жыцця, прыгажосці і непаўторнасці старэння.

Упершыню на выстаўцы можна пабачыць акварэлі і графіку Аляксандра Шаўчэнкі. Работы мастака, выкананыя больш за паўстагоддзя таму, дапамагаюць прасачыць, як рэагуюць на час папера, слаі фарбаў, графіту. На выстаўцы можна ўбачыць і ўнікальную сваёй захавальнасцю вышыўку і шыццё часткі богаслужэбнага ўбору архірэя — паліцы.

— Так, цяпер існуе велізарная колькасць тэхналогій, якія штучна ствараюць бачнасць старэння прадмета. Выставачны праект «Прыгажосць, народжаная часам» дае магчымасць ацаніць прыгажосць натуральнага старэння; прасачыць, як час адбірае ў прадметаў першародны бляск, сакавітасць фарбаў, цэласнасць і аднастайнасць матэрыялу, але ў той жа час надзяляе рэчы ўнікальнымі меткамі, якія вылучаюць іх з мноства аналагічных рэчаў, — зацікаўліваюць супрацоўнікі Гомельскага палацава-паркавага ансамбля.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**



Дзеля памяці

# ПАЭТЫЧНАЕ ГУЧАННЕ МЕМАРЫЯЛА

**Выстаўка «Зямля Леаніда Левіна» — адзін з праектаў Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, прымеркаваны да 75-годдзя парка, у якім ён знаходзіцца. Але насамрэч назва адсылае не толькі да тых часоў, калі Леанід Левін разам з камандай таленавітых архітэктараў і скульптараў працаваў над стварэннем мемарыяльнага комплексу (менавіта так называўся праект) у парку Янкі Купалы. У свой час ён стаў шыкоўным падарункам да 90-годдзя Песняра, у выніку якога папулярнае месца адпачынку мінчан значна змяніла сваё аблічча. Тут не было ніводнай выпадковай дэталі, нават лаўкі, ліхтары і кветнікі ствараліся ў адным стылі. Таленавітыя творцы падбіралі сімвалы, якія паказвалі не толькі творчасць Купалы, але і ўсю культуру Беларусі. Гэта і папараць-кветка, і купальскі фантан — «Вянок», і скульптура самога Песняра, якія быццам выходзіць насустрач гасцям...**



Назва «Зямля Леаніда Левіна» — як даніна памяці аб заслужаным архітэктары Беларусі. І межы гэтай зямлі акрэсліць ужо цяжка, бо Леанід Мендэлевіч разам з вядучымі архітэктарамі краіны быў задзейнічаны ў праектах па рэгенерацыі Траецкага і Ракаўскага прадмесцяў, Верхняга Горада, Нямігі, аздабленні плошчы Якуба Коласа. Можна згадаць і пра будынкі Тэатра лялек, кінатэатра «Піянер», Міністэрства замежных спраў, афармленне станцый метрапалітэна «Плошча Леніна» і «Няміга». Двойчы ён стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь: у аўтарскім калектыве за архітэктурна-манументальны ансамбль забудовы цэнтра Давыд-Гарадка і за мемарыял «Дзецям — ахвярам Вялікай Айчыннай вайны» ў Чырвоным Беразе. Уласна, зямля Леаніда Левіна — гэта ўся тэрыторыя, дзе ён ствараў, дзе праз прастору і знойдзеныя для яе сімвалы наладжваў дыялог, змагаўся за захаванне гістарычнай праўды. А яшчэ яго зямля і там, дзе жывуць людзі, якія аб ім памятаюць. На выстаўцы нават прадстаўлены сертыфікат з Ізраіля, дзе яго сябры пасадзілі дрэвы ў гонар Леаніда Левіна.



Як прызналася **дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Ганна ГАЛІНСКАЯ,** у год, калі ўстанова адзначыць сваё 80-годдзе, адмыслова збіраліся ідэі і ствараліся праекты — як выставачныя, так і культурна-масавыя, прымеркаваныя да юбілею. Новая выстаўка дазваляе больш даведацца не толькі пра тое, што было зроблена для ўшанавання памяці Песняра, але і наогул паказаць цэлую эпоху, калі ствараліся архітэктурныя шэдэўры. Найвышэйшую дзяржаўную ацэнку атрымаў мемарыяльны комплекс «Хатынь». Як узгадваў Леанід Левін, галоўным было не тое, колькі аўтобусаў з турыстамі туды прывозілі, а што Хатынь сапраўды стала народным помнікам. Сюды пацягнуліся простыя людзі, многія з якіх раней ніколі не выязджалі за межы сваёй вёскі. Кранала, калі яны даставалі свае торбачкі, расцілалі посцілкі побач з месцам, дзе былі хаты, і паміналі тых, каго забрала вайна...

Працы Левіна — гэта не проста аб'екты, прысвечаныя пэўным асобам і гістарычным падзеям, яны вучаць разважаць, спалучаць розныя віды творчасці. Як адзначыў на адкрыцці выстаўкі скульптар, член Беларускага саюза мастакоў, лаўрэат міжнародных конкурсаў графікі і скульптуры Аляксандр Шапо, які разам з Леанідам Левіным працаваў над манументамі ў Бабруйску і ў Благаўшчыне, толькі дзякуючы Леаніду Мендэлевічу ён даведаўся, што такое паэтычнае гучанне мемарыялу.

Выстаўка — сумесны праект з Творчай майстэрняй Леаніда Левіна. Яе кіраўнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, дачка архітэктара Галіна Левіна заўважыла, што той перыяд творчасці яе бацькі, калі ствараўся парк Янкі Купалы ды іншыя аб'екты, выдатна дэманструе, як перапляталіся музыка, архітэктура, скульптура, літаратура. Яна праглядала старыя газеты і адчула, што калегі яе бацькі былі літаратарамі і філосафамі, яны фарміравалі асяроддзе і перадавалі пасылы грамадству, знаходзілі вобразы. А час тады быў зусім не для такіх пошукаў. Хутчэй былі запатрабаваны факты і прамыя адказы. Відаць, таму мемарыяльны комплекс так не спадабаўся тагачаснаму міністру культуры СССР — Кацярыне Фурцавай. Але ў той час столькі людзей адстаялі работу беларускіх аўтараў, і мемарыял у 1970 годзе быў адзначаны Ленінскай прэміяй за архітэктуру.

Менавіта Галіна Левіна правяла першую экскурсію па выстаўцы. Многія экспанаты тут выстаўлены ўпершыню, сярод іх — асабістыя рэчы сям'і Левіных. Нават дзіцячыя кнігі і фота раскрываюць асобу. Напрыклад, у 60-я гады — вельмі напружаны час, калі ішла работа над Хатынню ды іншымі праектамі, — Леанід Мендэлевіч знаходзіў час, каб расказаць дачцэ казкі, вершы. У архітэктара было шмат сяброў сярод пісьменнікаў і іншых творчых людзей. Памяць пра іх захоўваецца ў сямейных архівах — гэта фатаграфіі, кнігі з дароўнымі подпісамі. Калі выбіраліся экспанаты, супрацоўнікі літаратурнага музея ўпадабалі адну з фатаграфій, калі Леанід Левін у сябе на лецішчы сустракаўся з Ігарам Лучанком. Так сталася, што рэчы, якія патрапілі на фота (напрыклад, ваза, карціна), захаваліся. У адной з вітрын адноўлены інтэр'ер з таго здымка.

Галіна Левіна распавяла пра сваю ранейшую ідэю стварыць музей адной сям'і. Захаваліся нават вырабы яе бацькі з прыродных матэрыялаў. У 1962 годзе беларускае тэлебачанне зняла сюжэт, як малады архітэктар робіць розныя кампазіцыі з карчоў і іншых фрагментаў дрэў. У наш час гэта даволі папулярнае хобі, а тады лічылася нечым новым, нават смелым. На экспазіцыі можна пабачыць джэмпер і гальштукі Левіна. Натуральна, творчыя людзі ўдзялялі ўвагу свайму выгляду, іх нават маглі лічыць піжонамі. Галіна падзялілася планамі, каб у будучым зрабіць дэманстрацыю адзення, абутку, рэчаў.

За шклянымі вітрынамі — алоўкі, лякала, цыркуль, простыя інструменты, пры дапамозе якіх ствараліся выявы будучых шэдэўраў архітэктуры. Ёсць тут і кніга «Архітэктура Беларусі», у якую ўвайшлі малюнкі студэнтаў архітэктурнага факультэта. Левін ездзіў разам са студэнтамі, калі збіраўся матэрыял. У сям'і захаваліся і тыя работы, якія ў гэтую кнігу не ўвайшлі. Напрыклад, абмеры царквы ў Кажан-Гарадку. Упершыню выстаўляецца і эскіз аб'екта з радкамі з твораў Купалы, які Леанід Левін рабіў для Лагойска. Праект гэты не быў рэалізаваны.

Асобныя экспанаты знаёмяць з лёсам Левіна. Прадстаўлены праект «Каханне і вайна» — гэта расповед пра глыбокія пачуцці, сямейныя сувязі, клопаты, мары. Тут пададзены лісты, якія дасылалі адно аднаму яго бацькі ў гады вайны. Ёсць тут і першы ліст з эвакуацыі да таты ад маленькага Лёні, які толькі навучыўся пісаць, і малюнак, які ён зрабіў для бацькі ў 1942 годзе...

А яшчэ выстаўка насычана фатаграфіямі, што паказваюць як рабочыя моманты архітэктара, так і шматлікія сустрэчы.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

Спрадвечнае

# І неба было мала, і зямлі

## У знакамітай Вязынцы масава гукалі вясну

**Запозненая вясна знешне нагадвае гераіню «Службовага рамана» Людмілу Пракопаўну (Мымру), якой прыгажосць і жаночы шарм былі непатрэбныя. Шэрую непрыкметнасць дзелавой дамы перамагло каханне. Вясну-красну беларусы гукаюць і зазываюць ад зімовай Масленіцы на асфальтавых пляцоўках, вясковых падворках і гістарычных лакацыях, водзячы карагоды і співаючы гучныя песні. Прычым выкананне, пранікнёнае высокімі пачуццямі, у народнікаў-фальклярыстаў не горшае, чым ва ўзорнага хору абласнога ўзроўню. Аднак вясна нешта марудзіць (можа, цану набівае, як усе прыгажуні) і не спяшаецца расцвітаць усімі сваімі фарбамі.**



У першую нядзелю красавіка на тэрыторыі дома-музея Янкі Купалы адбылося маштабнае, з магічнымі абрадавымі элементамі, народнае свята «Гуканне вясны». Традыцыйная цішыня знакамітай мясцовасці, дзе нарадзіўся вялікі пясняр, была парушана крэатыўнымі беларусамі, якія прыехалі на Маладзечаншчыну з розных куткоў краіны. Калі на чыгуначным прыпынку «Вязынка» з электрычкі высыпаў народ, дагэтуль перапоўненыя вагоны засталіся амаль пустымі.



Гуляць, вясну клікаць — справа адказная і агульная, і цікавая сваім тэатралізаваным відовішчам. Прыбраная ў нацыянальныя кашулі моладзь з гарачымі позіркамі, бацькі з дзецьмі, кабеты і дзядзькі (прадстаўнікі і прыхільнікі гістарычна-этнічных суполак і гуртоў ад розных рэгіёнаў) гукалі вясну так, што папяровыя птушачкі, падвешаныя на дрэўцах, ад гукавой вібрацыі сталі круціцца хутчэй. Драўляную танцпляцоўку на трываласць выпрабоўвалі аматары іскрамётнай «Лявоніхі», «Полькі-Янкі», «Крыжачка» і іншых народна-брэндавых танцаў.

Чарку на пасашок ніхто нікому афіцыйна не прапаноўваў, але ж для абрадавага падабенства гасцінная спадарыня музыкам-валачобнікам налівала з глінянага гарлачыка нейкі добры напой, і закусіць давала каўбасой «пальцам пханай». На кірмашы стаялі чэргі за пачастункам, чаем, кавай. Мёд ад вясковых пчол (так рэкламаваў свой тавар адзін з пчаляроў, быццам бы існуюць гарадскія пчолы), гарбата на зёлках, майстар-клас па вырабе сыру з дэгустацыяй — і хлеба, і відовішчаў хапала ўсім. Звычайна сумныя рамеснікі страпянуліся, бо людзі падыходзілі да іх вышыванак, кубачкаў, саламяных і драўляных вырабаў і перакупленага шырспажыву і нават бралі штосьці. Напрыклад, хітом продажу сталі гліняныя свістулькі, якімі ў асноўным маладыя бацькі затыкалі дзецям рот: і «па тэме», і кароткі адпачынак ад бясконцых «чаму» і «хачу». Хлопчыкам і дзяўчынкам з сярэдняй школы № 159 Мінска, удзельнікам фальклорнага гурта «Явар», свістулькі і выпечаныя з цеста птушкі дасталіся як рэквізіт для выступлення (артыстам шанцуе калі-небудзь.)

Галоўнымі рэжысёрамі грандыёзнага фэсту ў Вязынцы «Гуканне вясны» традыцыйна выступіла (ва ўсіх сэнсах) Студэнцкае этнаграфічнае таварыства. «Гу-у-у!» — як задобрылі вясну, так адразу і пацяплела! У любым выпадку не трэба грашыць на надвор'е, таму што ў прыроды няма дрэннага надвор'я, аб чым спявала некалі Аліса Фрэйндліх, якая выконвала ролю Людмілы Пракопаўны.

**Тамара ХАМІЦЭВІЧ,**
**фота аўтара.**

# ПАМЯЦЬ У РЭЧАХ

**У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры праходзіць выстаўка «Жменя сонечных промняў», якая прысвечана пісьменнікам — юбілярам гэтага года. Назва для яе «пазычана» ў Янкі Брыля — з яго лірычных нататак. Уласныя думкі і назіранні аўтар заносіў у свой блакнот падчас розных падарожжаў, сустрэч, знаёмстваў.**



Цэнтральны вобраз экспазіцыі — сонца, яго прамяні сімвалізуюць жыццёвыя шляхі пісьменнікаў, а таксама іх творчасць, талент, натхненне.

Тут прадстаўлены асабістыя рэчы, рукапісы, фатаграфіі, кнігі. Як заўважыў падчас адкрыцця выстаўкі **дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Сяргей УСІК,** усе прадметы — з фондаў музея, многія з іх раней не выстаўляліся. Кожны з іх дазваляе раскрыць пэўныя рысы характару іх гаспадароў, паказаць час, у якім яны жылі. Дарэчы, на долю большасці з юбіляраў выпалі няпростыя выпрабаванні: яны заспелі рэвалюцыйныя падзеі, Першую і Другую сусветныя войны. Так, бацька Міхася Лынькова памёр у гады Першай сусветнай вайны, хутка не стала і яго маці. Хлопцу, якому на той час не было яшчэ і 20 гадоў, давялося клапаціцца аб двух малодшых братах і сястры. У 1941—1942 гадах Лынькоў быў рэдактарам франтавой газеты «За Савецкую Беларусь». У 1941 годзе захопнікі расстралялі яго жонку і сына. Пасля вайны ўжо разам з новай спадарожніцай жыцця пісьменнік удачарыў дзвюх дзяўчынак. З асабістых рэчаў Лынькова, якія прадстаўлены на выстаўцы, — партсігар, гадзіннік, запінкі, кашуля, прывезеная з ЗША. Магчыма, яе ён набыў, калі ўдзельнічаў у Генеральнай Асамблеі ААН. Тут жа можна пабачыць рукапіс рамана «Векапомныя дні» і ілюстрацыі розных гадоў, зробленыя да кніг Лынькова мастаком Анатолем Волкавым, напрыклад малюнак Міколкі-паравоза.

Яшчэ адзін з юбіляраў 2024 года — Алесь Якімовіч. Гэты пісьменнік унёс вялікі ўклад у беларускую дзіцячую літаратуру, яго нават лічаць адным з яе пачынальнікаў. На выстаўцы прадстаўлены яго аўтабіяграфія, чытанка для другога класа, кнігі з апрацаванымі ім казкамі (напрыклад, такімі як «Каток — залаты лабок» і «Як кот звяроў напалохаў»). Алесь Якімовіч таксама быў перакладчыкам дзіцячых твораў: ён пераклаў казкі Пушкіна і братоў Грым.

Большасць юбіляраў, прадстаўленых на часовай экспазіцыі, былі звязаны з літаратурным аб'яднаннем «Маладняк». Адным з першых яго сяброў быў Максім Лужанін. За пачуццёвасць і эмацыянальнасць гэтага пісьменніка параўноўвалі з Багдановічам і Ясеніным. Таму адзін з экспанатаў выстаўкі — ручка з партрэтам Ясеніна.

Сярод «маладнякоўцаў» былі Аркадзь Куляшоў і Артур Вольскі. Апошні, хоць і пакінуў літаратурную спадчыну, усё ж марыў стаць мастаком і нават паступіў у Віцебскае мастацкае вучылішча. Вось толькі вайна перарвала яго планы. Па рэчах відаць, што Аркадзь Куляшоў быў аматарам шахмат. Пасля вайны ён нават узначальваў камітэт, які займаўся папулярызацыяй гэтага віду спорту.

Самым жа «маладым» юбілярам на выстаўцы стаў Іван Чыгрынаў. Яму сёлета магло б споўніцца 90 гадоў. Яго творы перакладаюцца на розныя мовы, па іх пішуцца сцэнарыі. Сёння актыўна развіваецца рэгіянальны турызм і ствараюцца кнігі, прысвечаныя невялікім гарадам і вясковым населеным пунктам, а менавіта Іван Чыгрынаў адным з першых узяўся за папулярызацыю лакальнай гісторыі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**